ЛЕКСІКА З КАНАТАЦЫЙНЫМ ЗНАЧЭННЕМ У МАСТАЦКІМ КАНТЭКСЦЕ

ТЭМАТЫЧНЫЯ І ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫЯ ГРУПЫ СЛОЎ

Лексіка з канатацыйным значэннем у мастацкіх тэкстах – адзін з самых моцных, яркіх сродкаў выражэння эмацыянальных ацэнак і характарыстык літаратурных персанажаў, выкарыстанне якога абумоўлена аўтарскай задумай, звязана з ідэйным зместам твора і сістэмай яго вобразных сродкаў.

Як сведчыць фактычны матэрыял, найбольш часта і шырока пісьменнікамі выкарыстоўваецца лексіка са значэннем узуальнай канатацыі, паколькі яна выступае ў якасці "гатовага" моўнага матэрыялу, што патрабуе ад аўтара ўмелага абыходжання з ім.

На аснове таго, што ў мове традыцыйна адрозніваюцца, як правіла, два тыпы узуальнай канатацыі, вылучаюцца наступныя лексічныя сродкі яе выражэння: лексічныя адзінкі з узуальна абумоўленым канатацыйным значэннем (*бамбіза, лыбіцца, гугніць, мардаты, лапавухі*) і лексічныя адзінкі з узуальна актуалізаваным канатацыйным значэннем (*мужчына, чалавек, паэт, настаўнік*).

Лексічныя адзінкі з узуальна абумоўленым канатацыйным значэннем падзяляюцца на тры групы: 1) уласна канатацыйная лексіка; 2) лексіка з фармальна выражаным канатацыйным значэннем; 3) лексіка з пераносным метафарычным канатацыйным значэннем.

Уласна канатацыйная лексіка характарызуецца генетычна ўласцівай ёй устойлівай канатацыяй, якая не страчваецца і па-за кантэкстам. У складзе названай групы акрэсліваюцца тэматычныя групы назоўнікаў: 1) найменні чалавека (*мацак, загладуха, грукач, вырвус, краля*); 2) назвы частак цела чалавека (*кудлы, капылы, трыбух, зяпа, мурло*); тэматычныя групы прыметнікаў, што характарызуюць чалавека паводле: 1) фізічнага стану (*хліпкі, жылісты, лядашчы*), 2) маральных, унутраных якасцей (*скупы, лапатлівы, ручы, языкасты*), 3) знешняга выгляду (*гламаздаваты, файны, лупаты*); тэматычныя групы дзеясловаў, што характарызуюць: 1) рух і перамяшчэнне чалавека ў прасторы (*дыбаць, шалыгаць, тупаць, шыбаваць, несціся*), 2) працэс маўлення (*вярзці, пустазвоніць, лапатаць*), 3) фізіялагічныя дзеянні чалавека (*жэрці, жлукціць*), 4) інтэлектуальныя здольнасці (*кумекаць, петрыць, ушалопаць*), 5) інтэнсіўнасць працоўнай дзейнасці (*гарбець, выжыльвацца, петаваць*), 6) творчую дзейнасць чалавека (*рыпаць, наярваць, выцінаць*) і некаторыя іншыя.

Лексіка-семантычныя аб'яднанні назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў, якія ўваходзяць у склад пералічаных тэматычных груп, колькасна неаднолькавыя. Найбольшай разнастайнасцю вылучаюцца першая тэматычная група назоўнікаў – "найменні чалавека" (27 ЛСГ); другая і трэцяя тэматычныя групы прыметнікаў – "маральныя, унутраныя якасці чалавека" (17 ЛСГ), "знешні выгляд чалавека" (16 ЛСГ); першая, другая і трэцяя тэматычныя групы дзеясловаў – "рух і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перамяшчэнне чалавека ў прасторы” (9 ЛСГ), “працэс маўлення” (5 ЛСГ), “фізіялагічныя дзеянні чалавека” (11 ЛСГ).

Культура стварэння мастацкіх вобразаў-характараў у творах сучасных беларускіх пісьменнікаў звязана з выкарыстаннем шматлікіх слоў-ацэнак, на якія багата жывая народная мова. Асаблівую выразнасць і мастацкую выяўленчасць яны набываюць тады, калі ўжываюцца для характарыстыкі чалавека, літаратурнага персанажа. З іх ліку ў першую чаргу вылучаецца вялікая тэматычная група канатацыйных найменняў асобы з агульным семантычным кампанентам “чалавек”. Большая частка слоў гэтай групы ўзнікла паводле словаўтваральных мадэляў, з дапамогай адпаведных фармантаў – суфіксаў: *-к-а (-к-о), -ак- (-як-), -ак-а (-як-а), -ік- (-ык-), -нік-, -ук- (-юк-), -ух- (-юх-), -ун-, -ец- (-эц-), -ач-, -л-а (-ал-а), -ач-а (-яч-а), -уч-а (-юч-а), -ар- (-яр-), -ачк-а, -еч-а* і інш. Некаторыя назоўнікі ўтвараюць сінанімічна-суфіксальныя лексіка-семантычныя варыянты *(-ык-/-ік-/-нік-/-юк-*: *жэўжык – свавольнік – распуснік – балаўнік – накольнік – блазнюк*; *-ан-/-ач-/-іл-а*: *лабан – грукач – вярзіла – здаравіла – граміла*; *-ун-/-ан-/-ёр-*: *крыкун – гарлапан – гарладзёр*; *-ак-/-ік-*: *слабак – дохлік* і інш.) або ўступаюць у антанімічныя адносіны (*гаварун – маўчун, мудрэц – дурань, таўсцяк – сухарляка* і да т. п.). Такія адзінкі часам разглядаюць у складзе марфалагічна аформленай канатацыйнай лексікі. Але суфіксы толькі ўзмацняюць тую эмацыянальную ацэнку прадмета, якая заключана ў самім рэчыўным значэнні лексемы. Акрамя таго, да слоў гэтай групы ў мове немагчыма падабраць зыходныя нейтральныя аналагі. Таму невыпадкова яны разглядаюцца як уласна канатацыйныя лексічныя адзінкі.

У першую тэматычную групу ўваходзяць наступныя ЛСГ назоўнікаў, якія характарызуюць чалавека паводле: фізічнай сілы (*мацак, лабан, грукач, слабак, дохлік*), камплекцыі, целаскладу (*худзізна, сухарляка, таўсцяк, загладуха, каржак*), узросту (*піскля, галапуз, падшыванец, малакасос, перастарак*), росту (*бамбіза, карантыш, недаростак*), інтэлектуальных якасцей (*мудрэц, разумец*), адносін да працы, жадання працаваць (*працавень, рабацяга, беларучка, паваляка, няўдака, недарэка, пэцкаль, папіхач*), матэрыяльнага становішча (*міраед, куркуль, багатырка, лапцюжнік, абшарпанец, рэпанка, басота, галота*), маральна-этычных якасцей – гонару, сумлення (*часняга, абдзірач, прайдзісвет, крутасвет, урвіцель, шэльма, манюка*), манеры гаварыць (*балбатун, лапатуха, гугніла, вярза, маўчун*) і інш.

Другая тэматычная група назоўнікаў – гэта лексічныя адзінкі, якія адыгрываюць не менш значную ролю пры характарыстыцы асобы і якія можна аб’яднаць пад адным загалоўкам “назвы частак цела чалавека”: *трыбух* – жывот; *капылы* – ногі; *кудлы* – валасы; *зяпа, пашча* – рот; *зекры, бізюкі* – вочы; *морда, мыза, мурло, храпа, рыла* – твар; *галаўня, мазгавешка* – галава і інш.

Канатацыйна значымыя прыметнікі можна падзяліць на тры тэматычныя групы, кожная з якіх мае свае лексіка-семантычныя аб’яднанні. Першая група – гэта прыметнікі, якія ацэньваюць фізічны стан чалавека, даюць характарыстыку яго фізічных якасцей. Сюды ўваходзяць ЛСГ прыметнікаў з агульным семантычным кампанентам ‘фізічна моцны, здаровы, дужы, вынослівы’: *жылісты, двухжыльны, трывушчы*; ‘фізічна слабы, кволы, хваравіты’: *лядашчы, нядошлы, недалужны,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нягеглы, балесны; ‘хуткі, жвавы, рухавы, спрытны’: *порсткі, вяртлявы, трапяткі, варушкі* і інш.

Другую тэматычную групу складаюць прыметнікі, што характарызуюць маральныя, унутраныя якасці чалавека. Тут вылучаюць некалькі ЛСГ з агульным семантычным кампанентам ‘вельмі скупы, прагны’: *сквапны, скнары, жміндлівы, хцівы, ласы*; ‘дбайны, клапатлівы, старанны’: *руплівы, рупны, пільны*; ‘працавіты, умелы ў працы’: *ручы, падхватны, цягавіты, уцёглы*; ‘замкнуты, які цураецца людзей’: *ваўкаваты, сугнеяваты, зверавaты, панурэйкаваты*; ‘гаваркі, які многа гаворыць’: *брахлівы, балбатлівы, лапатлівы, языкаваты* і інш.

Трэцюю групу ўтвараюць прыметнікі, якія характарызуюць знешні выгляд чалавека. Зафіксаваны наступныя ЛСГ з агульным семантычным кампанентам ‘худы, высахлы’: *зблажэлы, выпетраны, кашчаваты*; ‘прыгожы, слаўны’: *гожы, файны, важнецкі, паглядны, паказны*; ‘нязграбны, няскладны, непаваротлівы’: *гламаздаваты, нехлямяжы, цельпукаваты, целюкаваты, медзведзяваты* і інш.

Слова ацэньвае, характарызуе не толькі асобу, яе знешнія і ўнутраныя якасці, але і дзеянне, якое яна выконвае. Усе вылучаныя дзеясловы, што характарызуюць асобу па дзеянні, можна падзяліць на некалькі тэматычных груп, якія вызначаюцца сваёй шматлікасцю і разнастайнасцю. Так, першая група ўключае дзеясловы руху і перамяшчэння. У яе склад уваходзяць ЛСГ дзеясловаў з агульным семантычным кампанентам ‘ісці’: *джгаць, сігаць, шпарыць, шыбгаць, шыбаць, шыбаваць* – ісці хутка, жвава, шпарка; *калдыбаць, шамаць, брысці, цягнуцца, сунуцца, валачыся, плесціся* – ісці павольна, з цяжкасцю; *шкандыбаць, клыпаць, чыкільгаць* – ісці пакульгваючы; *валюхацца, куляцца, калываціца, гойдацца* – ісці, перавальваючыся з нагі на нагу; ‘хадзіць’: *швэндацца, валачыцца, цягацца, шлындацца, сноўдацца, брындацца, валэндацца* – хадзіць без справы, без занятку; *шнынарыць, шнырыць, шастаць* – хадзіць у розных напрамках; ‘бегчы’: *шпарыць, шыбаваць, шыбаць, джгаць, сігаць, імчацца, несціся* – бегчы хутка; *трухаць* – бегчы марудна, не спяшаючыся і інш.

Другая група – гэта дзеясловы, якія характарызуюць працэс маўлення. Яны паказваюць каштоўнасць інфармацыі: *пустазвоніць, пляскаць, вякаць, плявузгаць, прастарэкаваць, балабоніць, балбатаць, чаўпці, вярзці*; верагоднасць інфармацыі: *змарозіць, звягнуць, ляпнуць, раструбіць, раззваніць, заліваць*; невыразнасць маўлення: *мямліць, мармытаць, гергетаць*; інтэнсіўнасць, тэмп дзеяння: *лапатаць, ласкатаць, бухнуць*; суадносіны аб’ёму тэксту і якасці або колькасці інфармацыі: *пляскаць, балбатаць, малоць, заліваціца, зюкаць, тарокацца, бубукаць, дудукаць, разбуркацца.*

Трэцюю групу складаюць дзеясловы, якія абазначаюць фізіялагічныя дзеянні чалавека. Яна ўключае ЛСГ дзеясловаў з агульным семантычным кампанентам ‘есці’: *жэрці, лупіць, сілкавацца*; ‘з’есці’: *выменціць, утрубіць, умяць*; ‘піць, выпіць (гарэлкі)’: *чаркаваць, жлукціць, хлястаць, апігушыць, лыкнуць, падвесяліцца*; ‘напіцца’: *насцёбацца, налыгацца, назбірацца, намурзацца, набрацца, насмактацца, налізацца* і інш.

Чацвёртая тэматычная група дзеясловаў, што абазначаюць інтэнсіўнасць працоўнага дзеяння чалавека, уключае ЛСГ дзеясловаў з агульным семантычным кампанентам ‘працаваць’: *выжыльвацца, гарбець, душыцца,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

таўчыся; ‘рабіць’: *шчыраваць, увіхацца, завіхацца, петаваць, улягаць, кешкацца, капацца.*

Пятая група – дзеясловы, якія адлюстроўваюць мастацкую дзейнасць чалавека. Сюды ўваходзяць ЛСГ дзеясловаў з агульным семантычным кампанентам ‘танцаваць’: *выкручваць, жарыць, даваць, лютаваць, соўгацца, таптацца, таўчыся*; ‘іграць на якім-небудзь музычным інструменце’: *брэнкаць, рыпаць, цягаць, таўчы, наярваць, рэзаць, жарыць, лупіць, даваць, выцінаць, утнуць* і інш.

Акрамя пералічаных, вылучаюць яшчэ некалькі ЛСГ дзеясловаў, якія адлюстроўваюць разнастайнасць чалавечай жыццядзейнасці.

Вялікая эмацыянальна-сэнсавая насычанасць даследаваных лексічных адзінак вызначае іх актыўнае выкарыстанне ў мастацкім тэксце (як у мове аўтара, так і ў мове персанажаў), дзе яны выконваюць самыя разнастайныя стылістычныя функцыі, з ліку якіх вылучаюцца:

• функцыя вобразнага выражэння,
• функцыя ацэнкі,
• функцыя характарыстыкі,
• эмацыянальная функцыя,
• экспрэсіўная функцыя,
• функцыя сродку стварэння камічнага,
• функцыя сродку павышэння экспрэсіўнасці ў аўтарскім апавяданні,
• характаралагічна-ацэначная, або функцыя мауленчай характарыстыкі,
• функцыя мастацкай дэталі,
• функцыя сродку стварэння мастацкага вобраза-характару,
• функцыя сродку вобразна-асацыятыўнай сувязі слоў у кампазіцыйнай структуры мастацкага тэксту.

Функцыянальна абумоўленае ўжыванне лексікі з канатацыйным значэннем у цеснай узаемасувязі з іншымі вобразнымі сродкамі дазваляе пісьменніку дасягнуць неабходнага стылістычнага эфекту пры стварэнні мастацкіх вобразаў-характараў.

Спіс літаратуры

1. **Вайгла, Э. А.** Эмоциональная лексика современного русского языка и проблемы её перевода (на русско-эстонском материале) : автореф. дис. … канд. филол. наук / Э. А. Вайгла. – М., 1978. – 21 с.

2. **Вольперт, Р. Х.** Коннотативный уровень описания грамматики : (На материале художественного текста немецкого языка) / Р. Х. Вольперт. – Рига, 1979. – 159 с.

3. **Вярхоў, П. В.** Назоўнікі на *-ар (-яр)* у беларускай мове / П. В. Вярхоў. – Мінск, 1970. – 64 с.

4. **Колшанский, Г. В.** Контекстная семантика / Г. В. Колшанский. – М., 1980. – 149 с.

5. **Купина, Н. А.** Коннотативность в семантической группе названий лица / Н. А. Купина, М. Ф. Скорнякова // Классы слов и их взаимодействие. – Свердловск, 1979. – С. 92 – 93.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. **Лещинская, О. А.** Суффиксальное словообразование атрибутивных существительных в современном белорусском языке : автореф. дис. … канд. филол. наук / О. А. Лещинская. – Минск, 1974. – 21 с.

7. **Сцяцко, П. У.** Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. – Мінск, 1990. – 222 с.

8. **Телия, В. Н.** Коннотативный аспект семантики номинативных единиц / В. Н. Телия. – М., 1986. – 142 с.

9. **Старычонак, В. Дз.** Метафара ў беларускай мове : на матэрыяле субстантываў : манаграфія / В. Дз. Старычонак. – Мінск, 2007. – 190 с.

Наталля ЛОБАНЬ,
кандыдат філалагічных навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ